Борьба Компартии Белоруссии против буржуазной и мелкобуржуазной идеологии в период создания фундамента социализма в СССР. Мн., 1981. *Уладзімір Міхнюк.*

**КАВАЛЁЎ** Міхаіл Пракопавіч (7.7.1897, станіца Брухавецкая Краснадарскага краю, Расія — 31.8.1967), савецкі военачальнік. Ген.-палк. (1943). Скончыў школу прапаршчыкаў (1915), Ваен. акадэмію РСЧА (1924), Вышэйшыя акад. курсы Акадэміі Генштаба (1948). Удзельнік 1-й сусв. вайны. У Чырв. Арміі з 1918. З 1937 нам. каманд. Кіеўскай ваен. акругай. З крас. 1938 каманд. войскамі *Беларускай ваеннай акругі* (у вер.—ліст. 1939 кіраваў Бел. фронтам, які ажыццяўляў паход у Зах. Беларусь). У сав.-фінл. вайну 1939—40 камандаваў 15-й арміяй. У Вял. Айч. вайну каманд., з ліп. 1945 пам. каманд. Забайкальскім фронтам. У 1945—55 нам., потым пам. каманд. шэрагу ваен. акруг. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1937—46. *Эмануіл Іофе.*

**КАЗАКÓЎ** Юрый Леанідавіч (н. 27.7.1950, г.п. Шуміліна), бел. гісторык. Канд. гіст. н. (1978). Скончыў БДУ (1972) і выкладае ў ім з 1975. З 1988 адказны сакратар гіст. серыі час. «Веснік БДУ». Даследуе стан бел. грамадства ў 16—17 ст., пытанні сац.-эканам. і паліт. гісторыі Беларусі 2-й пал. 20 ст. Аўтар падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў.

*Тв.*: Во имя великой цели. Мн., 1981 (у сааўт.); Имена в истории. Мн., 1993 (у сааўт.).

**КАЗЛÓЎ** Міхаіл Фёдаравіч (н. 1.1.1946, в. Гаўлі Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. ваен. дзеяч. Ген.-лейт. (1993). Скончыў Благавешчанскае вышэйшае танкавае каманднае вучылішча (1970), Ваен. акадэмію бранятанкавых войск (1977), Ваен. акадэмію Генштаба Узбр. сіл Рас. Федэрацыі (1998). З 1970 на камандных і штабных пасадах у Паўн.-Каўказскай, Туркестанскай ваен. акругах (прымаў удзел у баявых дзеяннях у Афганістане). З 1988 у Зах. групе войск, нам. камандуючага танк. арміяй. З 1992 камандуючы 7-й танк. арміяй, камандзір 7-га, 65-га армейскіх карпусоў. У 1997—2001 нач. Гал. штаба Узбр. Сіл — першы нам. міністра абароны Рэспублікі Беларусь.

**КАЗЛÓЎСКІ** Ігнат Ігнатавіч [1846, г. Гродна — 19.11(1.12).1889], бел. і рус. мовазнавец-славіст. Скончыў Маскоўскі ун-т. Даследаваў праблемы параўнальна-гіст., слав. і ўсх.-слав. мовазнаўства. Аўтар прац «Лёс народнай мовы ў Літве і на Жмудзі» (1869), «Аб родным склоне на «я» (1887), «Дзве сінтаксічныя асаблівасці рускай мовы» (на ням. мове, 1889), «Аб палеаграфічных асаблівасцях загінуўшага рукапісу «Слова аб паходзе Ігаравым» (1889) і інш.

**КАЗЛÓЎСКІ** Міхась (Міхаіл Міхайлавіч; н. 9.2.1960, в. Рабінавая Маладзечанскага р-на), бел. краязнавец, грамадскі дзеяч, крытык, публіцыст, выдавец. Працаваў на з-дзе, навук. супрацоўнікам Гудзевіцкага літ.-краязнаўчага музея, кіраўніком клуба ў Цэнтры эстэт. выхавання г. Маладзечна. З 2000 метадыст Маладзечанскай цэнтр. раённай б-кі. Заснавальнік клуба бел. патрыятычнай моладзі «Беларуская хатка» (1982—87), маст. гасцёўні Я.Драздовіча (1983), літ. музея У.Караткевіча ў Маладзечне (1984), адзін са стваральнікаў гіст.-краязнаўчага аб'яднання «Крывіч», арганізатар і 1-ы старшыня Маладзечанскага аддз. Т-ва бел. мовы імя Ф.Скарыны. Рэдактар-выдавец час. «*Куфэрак Віленшчыны*» (гл. Дадатак). Пад яго рэдакцыяй выйшлі 6 кніг паэзіі, прозы і краязнаўчай публіцыстыкі, 14 паштовак, прысвечаных дзеячам бел. культуры, 15 нумароў краязнаўчага дадатку «Куфэрак» да «Рэгіянальнай газеты». Аўтар шматлікіх краязнаўчых публікацый, рэцэнзій у перыяд. выданнях.

**КАЗЛЯКÓЎ** Уладзімір Ягоравіч (н. 11.6.1946, Мінск), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (2003). Скончыў БДУ (1972). Працаваў нам. сакратара к-та камсамола АН Беларусі. З 1977 у Бел. тэхнал. ун-це. Даследуе гісторыю паліт. партый Беларусі і Расіі, нац. праблемы.

*Тв.*: «Белорусская карта» Савинкова // Полит. собеседник. 1991. № 5; Эсеровская эмиграция: проекты и «прожекты» // Бел. думка. 1992. № 9; Идеи социализма и белорусское национальное Возрождение // Там жа. 1996. № 2; Палітычныя партыі Беларусі (пачатак XX ст. — канец 20-х гг.). Мн., 2000; Национальный вопрос и неонароднические партии: Начало XX в. — конец 20-х гг. Мн., 2001.

**КАМÍСІІ ЦК КАМПАРТЫІ БЕЛАРÚСІ па дадатковым вывучэнні гісторыі Мінскага патрыятычнага падполля.** Існавалі як часовыя калектывы, што ствараліся спец. пастановамі бюро ЦК з прадстаўнікоў ЦК КПБ, урада, К-та дзярж. бяспекі, Мінскіх абкома і гаркома КПБ, б. членаў падполля, ветэранаў вайны, вучоных-гісторыкаў і з'яўляліся важнай формай разгляду складаных пытанняў антыфаш. руху ў бел. сталіцы ў Вял. Айч. вайну. Іх функцыянаванне звязана гал. ч. з пераадоленнем наступстваў абвінаваўчага ўхілу ў адносінах да пэўнай часткі мінскіх падпольшчыкаў і падп. арг-цый, якія зарадзіўся ў час вайны з боку Цэнтр. штаба партыз. руху, ЦК КП(б)Б, органаў НКУС. У выніку камісіі, створаныя пастановамі ЦК 5.6.1949 і 5.10.1957, не правялі ні аднаго арганізац. пасяджэння з-за штучнага стрымлівання іх работы. Камісія, арганізаваная 23.11.1957, стала першай такога роду групай, якая пачала працу па дадатковым вывучэнні гісторыі *Мінскага патрыятычнага падполля.* У яе склад увайшлі В.І.Казлоў (старшыня), Ц.Я.Кісялёў, Ц.С.Гарбуноў, І.Ф.Клімаў, І.М.Макараў, В.Ф.Шаура, А.Дз.Рудак, П.З.Калінін. Сваім з'яўленнем камісія абавязана б. мінскім падпольшчыкам І.Дз.Будаеву, А.В.Каліноўскаму, Х.М.Александровічу, Г.А.Язубчык, І.І.Барсуку, У.С.Казачонку, Х.М.Пруслінай, Ф.С.Кузняцову, А.Ф.Верамейчык і інш., якія накіравалі ў Маскву лісты на імя 1-га сакратара ЦК КПСС М.С.Хрушчова. У лістах найперш патрабавалася прызнаць, што ў Мінску ў 1941—42 дзейнічалі не патрыёты-адзіночкі, а арганізаванае падполле на чале з Мінскім падп. гаркомам партыі. Камісія правяла сустрэчы з б. падпольшчыкамі, вывучыла матэрыялы, што захоўваліся ў Партархіве Ін-та гісторыі партыі пры ЦК КПБ і 21.1.1959 падала 1-му сакратару ЦК КПБ К.Т.Мазураву дакладную запіску «Аб дзейнасці ў г. Мінску падпольных партыйных груп і камуністаў-адзіночак у гады Вялікай Айчыннай вайны». 7.9.1959 бюро ЦК КПБ разгледзела матэрыялы камісіі і прыняло пастанову, у якой адобрыла вывады пра дзейнасць камуніст. падполля ў Мінску ў Вял. Айч. вайну, даручыла Ін-ту гісторыі партыі пры ЦК КПБ і Ін-ту гісторыі АН БССР абагульніць матэрыялы па Мінскаму камуніст. падполлю і падрыхтаваць гіст. даведку для публікацыі ў друку, Мінскаму гаркому КПБ разабрацца з парт. прыналежнасцю тых удзельнікаў падполля, пытанне аб якіх не вырашана, праявіць неабходны клопат пра падпольшчыкаў і іх сем'і. Гэта азначала прызнанне дзейнасці ў Мінску ў 1941—42 разгалінаванага падполля на чале з Мінскім падп. гаркомам КП(б)Б, зняцце з апошняга ярлыкоў, навешаных у час вайны паводле непацверджаных даных. У адпаведнасці з рэкамендацыяй камісіі ў 1961 выдадзена брашура «Аб партыйным падполлі ў Мінску ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 — ліпень 1944)», у якой упершыню ўпамінаецца прозвішча І.К.Кавалёва як члена Мінскага падп. гаркома КП(б)Б. Паводле брашуры, Кавалёў, апынуўшыся ў ням. турме, не вытрымаў катаванняў, «уступіў у супрацоўніцтва з нямецка-фашысцкімі акупантамі і быў вывезены ў Германію». Але дакументальных доказаў гэтага не прыводзіцца. Работа наступных камісій тычылася ў асн. паводзін і дзейнасці кіраўнікоў падполля. У сярэдзіне 1970-х г. у сувязі з пашырэннем доступу да архіўных крыніц перыяду Вял. Айч. вайны павялічылася колькасць зваротаў у парт. і дзярж. органы БССР і СССР ветэранаў партыз. і падп. барацьбы ў Беларусі (Клімаў, І.М.Цімчук, С.К.Ляшчэня, К.І.Дамарад, Я.М.Савіцкая, В.Ф.Мацюшка і інш.). Яны ставілі пад сумненне магчымасць абрання І.П.Казінца сакратаром Мінскага падп. гаркома КП(б)Б, патрабавалі дадатковай праверкі высновы пра здрадніцкую дзейнасць Кавалёва. На працягу 1976—78 у ЦК КПБ і ЦК КПСС паступіла больш за 15 такіх пісем. Найб. важныя з іх (Клімава, Дамарада, Ляшчэні) 12.5.1978 разгледзела бюро ЦК КПБ, запіску для якога рыхтавала камісія з ліку загадчыкаў аддзелаў арганізац.-парт. работы, навукі і навуч. устаноў, прапаганды і агітацыі, адм. органаў ЦК. Ніякіх перамен у ацэнцы ролі Казінца і Кавалёва тады не адбылося. Аднак дзякуючы